Рэзюмэ

*Городские белорусскоязычные: новый путь от “точки невозврата”?*

Т.Р. Рамза

Пры выпрацоўцы і ўсталяванні пісьмовых нормаў новай беларускай літаратурнай мовы ў 1910-1920-я гг. беларускія кадыфікатары бясспрэчную перавагу аддалі ўласнабеларускім моўным асаблівасцям, апелюючы да узусу беларускіх гаворак. Аднак ужо ў 1930-я гг. прыярытэт спецыфічна нацыянальнага (а значыць, і дыялектнага) быў гвалтоўна спынены праз агульную тагачасную савецкую палітыку ўніфікацыі моў і грэблівым стаўленнем да дыялектамоўных як да палітычна ненадзейнага і неперспектыўнага слоя грамадства. Фізічнае знішчэнне беларускамоўных навукоўцаў-інтэлігентаў, заможных вяскоўцаў, пастаянны грамадскі ціск на сялянства праз пастулат, што на дыялекце гавораць сацыяльна адсталыя групы насельніцтва і ў сацыялістычным грамадстве дыялекты павінны натуральна вымерці, – усё гэта сфарміравала той устойлівы комплекс «беларускамоўнай» непаўнавартасці, сацыяльна-псіхалагічныя наступствы якога найбольш выразна праявіліся ў пачатку XXI ст., калі колькасць вясковага насельніцтва стала ўтрая меншая за гарадское і беларусы-гараджане не хочуць / не ўмеюць / пазбягаюць і г.д. гаварыць па-беларуску. На думку спецыялістаў, «згортванне беларусізацыі ў канцы 1920-х з’явілася *точкой невозврата* да адраджэння беларускай мовы ў якасці асноўнай мовы Беларусі» (Н.Б. Мячкоўская). Абмяркоўваецца магчымасць вяртання да роднай мовы праз «новых» беларусаў – тое пакаленне гараджан, хто не пераЖыў у дзіцяча-юнацкім узросце псіхалагічнай траўмы і не мае пагарды да роднай мовы як кляйма вяскоўца-«калгасніка». Даследуецца іх грамадская дзейнасць у сферы мовы і спецыфіка іхняга гутарковага маўлення, арыентаванага на літаратурны стандарт.